# ХТО Ў КІТАЙ, А ХТО – У КАНАДУ...

Была тут і ўвогуле кранальная гісторыя. Перад самым пачаткам Вялікай Айчыннай вайны прыехала ў Шасціхаты, каб наведаць радню, ураджэнка Узбалаці, што нейкім чынам выйшла замуж за кітайца. Відавочна, спачатку прадстаўніца сям'і Юргілевічаў выехала ў Расію. Дзе яна сустрэла будучага мужа, невядома. Тым не менш, летам 1941 года прыбыла на радзіму з дзвюма дочкамі. У гэты час фашысты захапілі Беларусь, і маладая маці з дзецьмі не магла вярнуцца дадому. Усю акупацыю яны пражылі ў сваякоў, змагаючыся за выжыванне. Напрыканцы вайны няшчасная захварэла і памерла. Пахавалі яе на могілках у Забрэззі. Юныя кітаянкі, дачакаўшыся Перамогі, паехалі да бацькі. Іх далейшы жыццёвы шлях невядомы...

А вось прадстаўніца роду Саломкаў трапіла аж у Канаду – там і сёння жывуць яе нашчадкі. Родная сястра Марыя, жыхарка Узбалаці, у свой час гасцявала ў сваячкі. Сёння няма сярод нас падарожніцы, але легенды, больш падобныя на анекдоты, пра яе вандроўку за акіян жывуць сярод мясцовых жыхароў.

Сваяк Марыі Грыбоўскай накіраваўся ў пошуках шчасця ў Амерыку. Там чалавек з прозвішчам Яблонскі разбагацеў, стаў фабрыкантам. У 70-я гады на прадпрыемстве, што належыла нашаму земляку, адбылася стачка. Рабочыя ноччу праніклі ў дом гаспадара і забілі ўсю яго сям'ю. Пра гэты выпадак пісалі ў газеце "Известия", а галівудскімі кінематаграфістамі нават зняты фільм, дзе гісторыя Джоў Яблонскага паказана дакладна.

Ураджэнка Узбалаці Вера Суміна (Жамойдзіна) трапіла на Чукотку. Яна набыла адукацыю горнага інжынера і шмат гадоў працавала на золатаздабывальным камбінаце ў пасёлку Іўльцін. У такую далеч жанчына накіравалася не па сваёй волі. Узбалаць не абыйшлі бокам сталінскія рэпрэсіі. Іосіф Жамойдзін, бацька В. Сумінай, быў жаўнерам войска Польскага. Просты селянін аб'ехаў амаль увесь свет. Пабываў на Бліжнім Усходзе, у Польшчы, Англіі, Італіі... У складзе арміі Андэрса прымаў удзел у знакамітай бітве пры Монтэ Касіна, добра валодаў польскай, англійскай, італьянскай мовамі, пісаў вершы па-беларуску. У маладосці лічыўся актывістам мясцовага самадзейнага тэатра. Пасля вяртання на радзіму ў выніку даносу аднаго з суседзяў чалавек быў абвінавачаны ў тым, што ён – англійскі шпіён. Атрымаў пяць гадоў турмы і яшчэ столькі ж – высылкі. Сям'я пакаранага ні за што чалавека была вывезена ў Сібір. Пазней Іосіфа Іванавіча рэабілітавалі.

# ВАЙНА ПРЫНЕСЛА НЕЗАБЫЎНЫ БОЛЬ...

Мноства месцаў нагадвае аб мінулай вайне. Тут стаялі немцы. У доме Камара размяшчалася камендатура. Пасля прыходу Чырвонай Арміі ў Маракавай хаце быў шпіталь. У лясах хаваліся партызаны. І зараз у Шасціхацкім лесе можна знайсці сляды зямлянак, варонак ад снарадаў. Адразу пасля вайны і пазней хлапчукі знаходзілі патроны, гільзы ад снарадаў, каскі. У суседнім Забрэззі фашысты стварылі гета, куды сагналі ўсё яўрэйскае насельніцтва мястэчка. Жыхары навакольных вёсак, Узбалаці ў тым ліку, з павагай ставіліся да прадпрымальнікаў і гандляроў, сябравалі з імі. Таму дзень, калі адбылося масавае забойства, стаў для наваколля трагедыяй. Сумна і страшна адгукнуліся гэтыя падзеі і ў Шасціхатах. Маладая яўрэйка здолела ўцячы ад немцаў і праз вёску бегла ў лес. Людзі хацелі схаваць яе, але напалоханая бяглячка чамусьці іх не паслухала. Два паліцаі на веласіпедах дагналі яе і забілі. Да леса заставалася сто метраў... Вяскоўцы пахавалі жанчыну, а на тым месцы пасадзілі куст шыпшыны.

На фронт узбалатцы трапілі ў асноўным пасля вызвалення Беларусі. У свой час школьнікі пільна сачылі за тым, каб на кожнай хаце, у якой жыў ветэран, была прымацавана чырвоная зорка. Зараз, калі нават дзяцей былых ветэранаў няма на гэтым свеце, цяжка даведацца, з якіх двароў адправіліся на фронт мужчыны ў далёкія саракавыя гады. Дакладна вядома, што ваявалі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і вярнуліся з баявымі ўзнагародамі Іван Кароль, Іосіф Дземідовіч, Іван Грыбоўскі, Аляксей Ліштван. Дарэчы, дом І. Грыбоўскага ці дом Дамініковых (зараз належыць яго ўнуку) па-ранейшаму пазначаны зоркай. На 15 франтавікоў сем'і атрымалі пахавальныя.

# ПОДЫХ ГІСТОРЫІ

Землі абапал Узбалаці літаральна дыхаюць гісторыяй. Мікалай Паўлавіч Грыбоўскі лічыцца мясцовым краязнаўцам. Ён помніць прозвішчы ўсіх паноў, якім у розныя перыяды належылі навакольныя землі. Напрыклад, руская пані Райкова. Гэта была асоба знатнага роду, яе продкі атрымалі зямлю на Беларусі за заслугі перад Расійскай імперыяй. З прыходам палякаў пані з'ехала на радзіму. Пан Макрыцкі і яго зяць Камар – таксама частка летапісу вёскі. У час калектывізацыі іх маёнткі сталі падмуркамі для стварэння калгаснай інфраструктуры. Рэшткі будынкаў дагэтуль стаяць на былым калгасным двары ў Лапаўшчыне. Хоць ад сядзібы Камара не захавалася нічога, месца гэта і зараз называюць "У Камара". Раней тут размяшчаліся калгасныя фермы, быў вялікі сад.



*Мікалай ГРЫБОЎСКІ*

Адметнай фігурай у гісторыі вёскі можна лічыць прадпрымальніка Меера. Багаты яўрэй калісьці адкупіў у Макрыцкага пілараму. Гэта было даволі значнае прадпрыемства. Пачаў дзейнічаць млын. Вытворчасць забяспечвала працай многіх людзей. У час вайны ўся гаспадарка Меера згарэла. У жылым доме пазней была адкрыта першая хата-чытальня. Затым, аж да 90-х, тут размяшчаўся ФАП. Адна частка будынка была аддадзена пад кватэру сям'і настаўніцы. Зараз будыніна належыць уласніку, ідзе рамонт.



*Былы дом Меера.*

Непадалёк знаходзіцца, былы дом Макрыцкага, праўда, ужо ў моцна аварыйным стане. Хутчэй, гэта была дача, бо ў асноўным сям'я багатага чалавека жыла ў Вільні. Пасля ўстанаўлення савецкай улады ў прыгожым будынку, акружаным садам, размясцілася школа.

Асобнай старонкай упісаны ў гісторыю Узбалаці лёсы людзей, што называліся асаднікамі (польскія грамадзяне, якім урад паводле спецыяльнага закона 1920 года выдзеліў землі на тэрыторыі Заходняй Беларусі). Само слова "асада" азначае сядзібу. Гэтых сядзіб уздоўж савецка-польскай мяжы было шмат. Качынскі, Марэк, Нітунь, Гольда, Ныч, Бэнга, Канэцкі, Маркоўскі... І зараз старажылы могуць паказаць месцы, дзе жылі гэтыя людзі. Калі асаднікаў вывезлі, пабудовы разабралі, а падмуркі ў акружэнні бэзавых кустоў можна бачыць і зараз...

# УЗБАЛАЦКІЯ АСВЕТНІКІ



*Алея, што вядзе да будынка былой школы.*

Асобнае месца ў сэрцах выхадцаў з Узбалаці займае школа, першым дырэктарам якой быў прыезджы настаўнік-гісторык Юрый Антонавіч Паўленка. Ён і яго жонка-матэматык Праскоўя Лукінічна з'яўляліся сапраўднымі асветнікамі. Дзякуючы іх намаганням, навакольныя вёскі назаўсёды развіталіся з неадукаванасцю. Менавіта ў той час былі закладзены традыцыі будучай васьмігодкі, якая на працягу дзесяцігоддзяў славілася на ўсю Валожыншчыну. Значны ўклад у яе развіццё ўнесла былы дырэктар Галіна Васільеўна Кароль. У час яе кіраўніцтва быў узведзены новы будынак. Выхаванцы заслужанага настаўніка БССР і яе моцнага калектыву раз'ехаліся па ўсім свеце. Сярод іх – ваенныя, вучоныя, настаўнікі, урачы, інжынеры, геолагі, шахцёры... Калектыў школы апераджаў час. Тут быў створаны першы ў раёне і адзін з першых у рэспубліцы школьны музей з гучнай назвай "Музей хлеба", існаваў вялікі вопытны ўчастак. Мелася нават невялікая гаспадарка – свінні, трусы, конь. Кіраўнік была яшчэ і здольнай мастачкай – у афармленні інтэр'ера адчуваўся адмысловы густ. Праводзілася вялікая выхаваўчая работа. Іван Іванавіч і Лідзія Аляксандраўна Далінкевічы, Іван Іванавіч Жаркевіч, Вера Лявонцьеўна Кароль, Ванда Іосіфаўна Ліштван, Вера Ануфрыеўна Грыбоўская, Любоў Мікалаеўна Рындзевіч, Ніна Міхайлаўна Сергіевіч, Галіна Сцяпанаўна Кароль... Імёны гэтых настаўнікаў залатымі літарамі ўпісаны ў гісторыю педагогікі Валожыншчыны...

Установы культуры – сельскі клуб і бібліятэка – таксама з'яўляліся гонарам вяскоўцаў. Мясцовага фельчара, гаспадыню ФАПа Галіну Герасімаўну Далінкевіч і сёння ўспамінае з вялікай удзячнасцю не адно пакаленне ўзбалатцаў. Працаваў у вёсцы і магазін, які нават у часы дэфіцыту славіўся шырокім асартыментам тавараў, мелася выдатная лазня...

**Да друку падрыхтавала Валянціна КРАЎНЕВІЧ, фота аўтара**

*(Працяг будзе)*